# ДРУГОЕ ПАСЛАНЬНЕ ЯНА БАГАСЛОВА

1 Старац - выбранай Спадарыні і дзецям яе, якіх я
любллю ў ісьціне, і ня толькі я, але і ўсе, хто спазанаў
ісьціну,
2 дзеля ісьціны, якая жыве ў нас і будзе з намі вечна:
3 хай будзе з вамі мілата, літасьць, мір ад Бога Айца і
ад Госпада Ісуса Хрыста, Сына Айца, у ісьціне і любові.
4 Я вельмі ўсьцешыўся, што знайшоў сярод дзяцей
тваіх такіх, якія ходзяць у ісьціне, як мы атрымалі ў
наказ ад Айца.
5 І сёньня прашу цябе, Спадарыня, ня як новую
запаведзь прадпісваючы табе, а тую, якую маем ад
пачатку, - каб мы любілі адно аднаго.
6 Любоў бо ў тым, каб жылі мы паводле запаведзяў
Ягоных. Гэта - тая запаведзь, якую вы чулі ад пачатку,
каб жылі згодна зь ёю,
7 бо многія зваднікі ўвайшлі ў сьвет, якія не вызнаюць
Ісуса Хрыста, што прыйшоў у плоці: такі чалавек
ёсьць зваднік і антыхрыст.
8 Сачэце за сабою, каб нам ня страціць таго, над чым
мы працавалі, а каб атрымалі поўную ўзнагароду.
9 Кожны, хто пераступае вучэньне Хрыстовае і ня
жыве ў ім, ня мае Бога; а хто жыве ў вучэньні
Хрыстовым, той мае і Айца і Сына.
10 Хто прыходзіць да вас і ня прыносіць гэтага
вучэньня, таго ня прымайце ў дом і ня вітайце яго;
11 бо хто яго вітае, той мае ўдзел у ліхіх учынках
ягоных.
12 Многае маю пісаць вам, ды не хачу на паперы
чарнілам; а спадзяюся прыйсьці да вас і гутарыць

вуснамі ў вусны, каб радасць вашая была поўная.
13 Вітаюць цябе дзеці сястры тваe выбранае. Амін.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 21 Feb 2024 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc